ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

НЯДЗЕЛЯ, 1 МАЯ 1938 г. № 24 (366)

Цана 20 кап.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

Першае мая

Песні-гімны радасці і лікавання і песні-заклікі да барацьбы, да вызвалення магутна і велічна прагучаць над зямлёй у дзень Першага мая.

49-ты раз міжнародны пролетарыят урачыста адзначае сваё свята—дзень інтэрнацыянальнай пролетарскай салідарнасці, дзень баявога агляду рэволюцыйных сіл. Першае мая—дзень мабілізацыі рабочага класа і працоўных усяго свету на барацьбу супроць фашызма і вайны, на барацьбу за мір і дэмакратыю, на абарону СССР—аплоту сусветной пролетарскай рэволюцыі.

Квітнее наша радзіма—яркае сузор'е адзінаццаці братніх соцыялістычных рэспублік пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі. Рука ў руку, з'ядначыя вялікай дружбай, ідуць пад сцягам партыі Леніна—Сталіна, па шляху соцыялістычных перамог народы Совецкага Саюза.

Пра радасць, пра шчасце жыцця спявае наш 170-мільённы совецкі народ. І ў дзень Першага мая гэтыя песні прагучаць велічным гімнам у гонар правадыра і друга народаў вялікага Сталіна, у гонар большэвіцкай партыі.

І як урачысты гімн прагучаць над нашай зямлёй словы прысягі, якую дадуць узрошчаныя Совецкай Краінай палкія патрыёты радзімы, маладыя байцы нашай Чырвонай Арміі і нашага Чырвонага Флота—«Я—сын працоўнага народа»... І словы прысягі на вернасць радзіме, рэволюцыі, партыі Леніна—Сталіна ў сэрцы сваім паўторыць увесь совецкі народ, гатовы ў кожную мінуту стаць на абарону сваёй свяшчэннай зямлі.

Мацаваць магутнасць Чырвонай Арміі — вернага абаронца мірнай працы народаў СССР і быць «у стане мабілізацыйнай гатоўнасці перад тварам небяспекі ваеннага нападу, каб ніякая «выпадковасць» і ніякія фокусы нашых знешніх ворагаў не маглі засцігнуць нас знянацку» (Сталін) — наш пярвейшы абавязак.

Нарастаючы новы жорсткі крызіс, галеча і голад працоўных мас, няспынна ўзрастаючае беспрацоўе, варварскае ўдушэнне цывілізацыі і культуры, — вось рысы капіталістычнага свету сёння. І над гэтым светам згушчаецца трупны смурод, палыхае крывавае полымя вайны.

Фашысты Германіі і Італіі топяць у крыві гераічны народ Іспаніі, які змагаецца за сваю незалежнасць і волю. Імперыялісты Японіі сеюць смерць і разбурэнне на зямлі Кітая. Гіглераўская Германія растаптала незалежнасць аўстрыйскага народа. Фашысцкія шакалы адкрыта рыхтуюцца да падзелу літоўскага і чэшскага народаў. Фашысцкія агрэсары пры папушчэнні так-званых дэмакратычных краін, у першую чаргу Англіі, распачалі гвалтоўны перадзел свету, распальваюць пажар новай сусветнай вайны, рыхтуюць напад на СССР—апору сусветнай рэволюцыі.

І Першае мая будзе днём далейшага пашырэння і ўмацавання народнага фронта барацьбы супроць фашызма і вайны.

Пролетарыят усяго свету выкажа пачуцці салідарнасці з гераічнымі народамі Іспаніі і Кітая. І на многіх мовах будуць паўтораны словы Далорэс Ібаруры: «Стрэльбы на плячах рабочых—лепшая гарантыя абароны дэмакратыі». Пролетарскія калоны прадэманструюць гатоўнасць змагацца і перамагаць пад сцягам комуністычнага Інтэрнацыянала—пад сцягам Леніна — Сталіна.

Позіркі ўсяго мыслячага прагрэсіўнага чалавецтва будуць звернуты да сонечна-ярка расквітнеўшай краіны — СССР. У гэтых позірках—захапленне ростам, сілай і магутнасцю краіны соцыялізма, упэўненасць у перамозе рэволюцыі на ўсім свеце, гатоўнасць падтрымаць Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, у якім прагрэсіўнае чалавецтва бачыць апору ў сваёй барацьбе супроць фашызма і вайны.

І яшчэ раз з новай сілай прагучыць праклянце ўсіх працоўных трацкісцка-бухарынскім і нацыянал-фашысцкім бандытам, якія рыхтавалі паражэнне СССР—бацькаўшчыны сусветнага пролетарыята.


Гнёзды наймітаў фашызма, трацкісцка-бухарынскіх бандытаў і буржуазных нацыяналістаў, разграміў совецкі народ. Нікому і ніколі не ўдасца аслабіць братні саюз народаў СССР, разбіць адзіную сям'ю совецкіх рэспублік.

БССР святкуе Першае мая ў часе разгортвання кампаніі па выбарах у Вярхоўны Совет БССР. І ў дзень Першага мая працоўныя БССР выкажуць перад усім светам сваю агульную волю і жаданне—26 чэрвеня—у дзень выбараў, аддаць свае галасы кандыдатам блока комуністаў і беспартыйных, слаўным патрыётам нашай радзімы, непахісным барацьбітам за шчасце рабочых і сялян, за соцыялізм.

Шчаслівы народ пагранічнай Совецкай Беларусі разам з усімі народамі вялікага Совецкага Саюза ў дзень Першага мая прадэманструе баявую гатоўнасць да абароны рубяжоў совецкай зямлі. Першамайскія калоны нашых героеў і слаўных нёсак прадэманструюць жалезную згуртаванасць працоўных Совецкай Беларусі вакол партыі Леніна—Сталіна.

Няхай жыве Першае мая—баявы агляд рэволюцыйных сіл міжнароднага пролетарыята!

Няхай жыве вялікі, непераможны сцяг Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна!



В. РАГУЦКІ

ВЫЙШЛІ РАНА З ПЕСНЯЮ ДЗЯУЧАТЫ...

Сад квітнее, буйны і багаты,
У зялёным шоўку сенажаць.
Вышлі рана з песняю дзяўчаты —
На вакзал — Ганулю сустракаць.

Сінь нябёс і маладыя травы
Скрозь віталі юнасці агонь.
Гарманіст прабег прывычна-жвава
Па ладах. Ударыла гармонь.

Вось яна прыедзе, дарагая,
З хваляваннем выйдзе на перон,
Усміхнецца радаснаму маю,
Прывітае сонца нашых дзён.

І прыпомніць вуліцы і паркі,
Камяніцы белыя, трамвай...
У Маскве — як лепшая даярка —
Святкавала Ганна Першы Май.

Доўга-доўга, поўная задору,
З захапленнем будзе гаварыць,
Як плылі крылатыя дазоры
Непарушных сталінскіх граніц;

І грымелі танкі, як буруны,
і цвілі калоны, як сады;
Як рукой, узнятай над трыбунай,
Іх вітаў любімы правадыр.

І дажджамі сыпаліся краскі,
Як ішлі магутныя палкі,
Ружавелі зорамі іх каскі,
Зіхацелі вострыя штыкі.

Выступала велічная сіла
І краса абуджанага дня...
На Чырвонай плошчы Варашылаў
Баявога стрымліваў каня.

У думках стануць перад імі:
Родны Сталін, юнасць і Масква.
І падругі шчыра аб радзіме
Будуць песню новую співаць.

Зашумяць высокія дубровы,
Звонкую страсаючы расу.
Аб Маскве хвалюючыя словы
У жыццё падругі панясуць.

Комуністычны Інтэрнацыянал к 1 мая 1938 года

Пролетарыі і працоўныя ўсіх краін!

Дзень 1 мая — дзень міжнароднай пролетарскай салідарнасці. Выключна баявое значэнне набывае ў гэтым годзе першамайскі агляд рэволюцыйных сіл міжнароднага пролетарыята.

Ніколі яшчэ з часу сканчэння сусветнай вайны не было такой абвостранай міжнароднай абстаноўкі. Чацвертая частка чалавецтва зноў ахоплена вайной. Аграбіўшы і закабаліўшы свае ўласныя народныя масы, фашысцкія ўрады ўрываюцца на чужыя тэрыторыі. Грабежніцкімі ваеннымі паходамі супроць іншых народаў яны хочуць заглушыць абурэнне працоўных уласных краін. Ад сваіх унутраных труднасцей і банкротства фашысцкага рэжыма яны шукаюць ратунку ў ваенных авантурах. Фашысцкія правакатары вайны цягнуць чалавецтва да новай сусветнай імперыялістычнай бойні.

На Далёкім Усходзе японская фашысцкая ваеншчына вядзе захватніцкую вайну супроць кітайскага народа, за ўладарства ў Азіі, за панаванне на Ціхім акіяне. Руйнуюцца гарады старажытняй культуры, спалены тысячы сяленняў, дзесяткі тысяч мірнага кітайскага насельніцтва расстрэлены японскімі катамі.

Але не зламіць катам гераізма чатырохсотмільённага кітайскага народа. Згуртоўваючыйся ўсё цясней у адзіны нацыянальны фронт, ён наносіць японскім захватчыкам цяжкія паражэнні. Абараняючы сябе, ён сваімі грудзьмі прыкрывае народы Азіі, ён натхняе ўсе каланіяльныя народы на барацьбу супроць сваіх прыгнятальнікаў.

У Іспаніі шалеюць полчышчы германа-італьянскіх інтэрвентаў. Бяссільныя зламіць упартае супраціўленне рэспубліканскай арміі, яны подла помсцяць яе мірнаму насельніцтву, знішчаючы з паветра тысячамі жанчын і дзяцей. З легендарнай адвагай змагаецца хутка два годы іспанскі народ за сваю незалежнасць супроць кааліцыі фашысцкіх дзяржаў, маўкліва падтрымліваемых рэакцыйна-кансерватыўнымі коламі Англіі. Пакінуты буржуазна-дэмакратычнымі ўрадамі, стойка абараняе іспанскі народ сваю дэмакратычную рэспубліку супроць аб'яднаных сіл сусветнай рэакцыі. Абараняючы сваю свабоду, ён абараняе справу ўсяго перадавога прагрэсіўнага чалавецтва.

Падбадзёраны міжнароднай беспакаранасцю сваёй інтэрвенцыі ў Іспаніі, германскі фашызм акупаваў **Аўстрыю.** Падаўленнем узброенай барацьбы рабочых у 1934 годзе, пазбаўленнем працоўных элементарных свабод кіруючыя класы Аўстрыі падрыхтавалі ўварванне германскага фашызма. Не паспеўшы трывала асесці ў Аўстрыі, германскі фашызм ужо рыхтуе напад на Чэхаславакію. Разам з польскім фашызмам ён імкнецца да захвату і падзелу Літвы. Ён ірвецца на Балканы, пагражаючы дзяржаўнаму існаванню і нацыянальнай незалежнасці балканскіх народаў. Ён пагражае Бельгіі, Галандыі, Швейцарыі і скандынаўскім краінам. Ён акружае фашысцкім кальцом Францыю, разлічваючы раптоўным ударам застаць яе знянацку. Як драпежны звер, ён рыскае ўсюды, стараючыся раздабыць сыравіну, матэрыяльныя рэсурсы і людскія рэзервы для вялікай вайны супроць краіны соцыялізма.

Хто вінават у тым, што фашысцкія зладзеі ўзнялі так нагла галаву, што яны распальваюць полымя вайны ў розных канцах свету?

Адказны за гэта рэакцыйныя колы англійскіх кансерватараў. Яны пальцам не ўзварухнулі, калі японская ваеншчына напала на Кітай. Яны толькі чакаюць ваеннага знясілення Японіі, каб паставіць пытанне аб падзеле Кітая. Яны ўвайшлі ў згоду з італьянскімі фашыстамі, каб дабіцца ўдушэння іспанскага народа. Яны падтрымлівалі германскі фашызм, даўшы магчымасць яму ўзброіцца. Яны выкарыстоўваюць яго, як крывавага жандара супроць міжнароднага рабочага класа і дэмакратычнага руху народаў. Яны благаславілі яго на ўварванне ў Аўстрыю. Яны паціху накіроўваюць яго на ўсход супроць краіны Советаў.

Адказнасць нясе таксама французская рэакцыйная буржуазія. Гэта яна садзейнічала ўмацаванню германскага фашызма сваёй капітуляцыяй перад ім. Падобна эмоўшчыкам Кобленца, французскія рэакцыянеры канспіравалі з германскім фашызмам супроць уласнага народа. Гэтыя цёмныя сілы дыктавалі ўраду Блюма палітыку блакады рэспубліканскай Іспаніі. Блок англійскіх і французскіх рэакцыянераў цягнуў на буксіры сваёй прафашысцкай палітыкі лідэраў соцыялістычнага і прафсаюзнага інтэрнацыяналаў, бяздзейнічаўшых перад тварам разбою германа-італьянскіх інтэрвентаў у Іспаніі.

Адказнасць за кроў, пакуты і афяры іспанскага народа, за разбойніцкі напад на Кітай, за ваенную акупацыю Аўстрыі нясуць не толькі фашысцкія зладзеі, але і тыя, хто патурае і садзейнічае ім.

Браты рабочыя!

Вас подла ашукваюць кіруючыя класы, калі гавораць, што нібы ў інтарэсах захавання міру, вы павінны прымірыцца з удушэннем іспанскага народа, закабаленнем Кітая, паднявольненнем Аўстрыі. Войн унікаюць не тым, што дазваляюць іх зачыншчыкам грабіць, умярцвляць іншыя народы. Войны прадухільваюць цвёрдай палітыкай своечасовага абуздання фашысцкіх разбойнікаў.

Вам цынічна хлусяць, калі сцвярджаюць, што ўрады Англіі, Францыі і ЗША бяссільны спыніць міжнародны фашысцкі разбой. Спыніць разбой яны могуць. А для гэтага трэба, каб яны прынялі **прапанову СССР аб сумесным выступленні** ўсіх дзяржаў, зацікаўленых у захаванні міру, супроць зачыншчыкаў вайны. Яны павінны падмацаваць сваё выступленне мерамі эканамічнага націску. Няхай пазбавяць крэдытаў фашысцкіх бандытаў, няхай адмовяць ім у сыравіне, неабходнай для вядзення войн, няхай закрыюць каналы гандлю з імі, няхай падвергнуць блакадзе не рэспубліканскую Іспанію, а тых, хто напаў на яе. Няхай адкрыюць граніцы і прадаставяць іспанскаму народу магчымасць свабодна закупляць узбраенне. І гэтага будзе дастаткова, каб фашызм адступіў, як пабіты сабака.

Не верце, таварышы, тым, хто сцвярджае, што ў вашым распараджэнні няма сродкаў, каб прымусіць урады праводзіць палітыку барацьбы супроць агрэсараў. Рабочы клас, прасякнуты сазнаннем барацьбы, — магутная сіла. Ён працуе на шахтах, заводах, ён прыводзіць у рух паязды і параходы, ён, а не хто-небудзь іншы. Голас соцень тысяч дэманстрантаў нікому не ўдасца заглушыць.

Але каб ваша сіла, браты пролетарыі, была прыведзена ў дзеянне, патрэбна **адзінства рабочага класа.** Трэба, каб у штабе вашых арганізацый не было здрады. Трэба, каб вашу барацьбу не зрывалі сітрыны, агенты англійскай буржуазіі.

Ваша сіла памножыцца ў многа разоў, калі ўсе атрады рабочага руху рука аб руку будуць змагацца супроць агульнага ворага — фашызма. **У інтэрнацыянальным яднанні барацьбы вы пачэрпнеце новую небывалую магутнасць.** Згуртаваны ў адзіным міжнародным фронце рабочы клас стане цэнтрам прыцягнення ўсіх антыфашысцкіх сіл свету. Сваім яднаннем ён набудзе саюзнікаў, дэманстрацыяй сваёй сілы ён рэволюцыянізіруе іх, удыхне у іх упэўненасць у перамозе. І тады народы, дэзарыентаваныя палітыкай так называемых дэмакратычных урадаў, палітыкай патурання фашызму, усвядомяць сваю магутнасць, падымуцца ўсюды супроць фашысцкіх злодзеянняў. Тады народы Германіі, Італіі, Японіі адчуяўшы ізаляцыю і банкротства фашысцкай шайкі, схопяць за горла сваіх прыгнятальнікаў. **І тады рух народнага фронта** супроць фашызма і вайны набудзе **нябачаны размах ва ўсім свеце.**

На гэты шлях барацьбы кліча працоўных Комуністычны Інтэрнацыянал. Да ўстанаўлення міжнароднага адзінага фронта барацьбы заклікаў ён не раз соцыялістычны і профсаюзны інтэрнацыяналы. Але сітрыны ўпарта адвяргалі гэтыя заклікі, зрываючы адзінства дзеянняў міжнароднага пролетарыята. Сваёй палітыкай расколу яны імкнуліся падарваць веру рабочага класа ў свае сілы, абяззброіць яго перад тварам ворага і тым самым заахвочвалі фашыстаў да далейшых агрэсій.

Рука аб руку з Сітрыным дзейнічалі трацкісцка-бухарынскія агенты фашызма, шпіёнскі «чацверты інтэрнацыянал». Гэта яны хацелі аднавіць капіталізм у СССР, расчляніць краіну Советаў, аддаць яе народы ў рабства фашызму. Гэта іх паследышы адкрывалі фронт фашысцкім інтэрвентам у Іспаніі, білі ў тыл яе рэспубліканскай арміі. Гэта яны, па заданню японскай разведкі, вядуць дыверсійную і шпіёнскую работу ў Кітаі. Гэта яны ўсюды выступаюць як шкоднікі рабочага руху, імкнуцца ў інтарэсах фашызма сарваць разам з Сітрыным адзінства дзеянняў міжнароднага рабочага класа. Гэта іх, гнусных шпіёнаў, дыверсантаў і забойцаў сітрыны і даны бяруць пад сваю абарону і робяць іх сцягам для прадаўжэння сваёй пагубнай палітыкі расколу.

Разгромам трацкісцка-бухарынскай шпіёнскай банды падпальшчыкаў вайны, подлых наймітаў японскага і германскага фашызма совецкі народ аказаў неацанімую ўслугу **справе міру, справе адзінства рабочага класа, справе антыфашысцкай барацьбы.**

Пролетарыі усяго свету!

Рэспубліканская Іспанія ў небяспецы. Лютыя ворагі іспанскага народа прарвалі Арагонскі фронт. Беспярэпынна яны перакідваюць новыя войскі і ўзбраенне. Сусветная рэакцыя дабіваецца паражэння іспанскага народа. Але перамогі іспанскага народа дабіваюцца мільёны рабочых ва ўсім свеце. Яны гатовы на найвялікшыя афяры, каб актыўна садзейнічаць гэтай перамозе.

Есць сродкі, ёсць шляхі, ёсць усе магчымасці сапраўды дапамагчы, не марудзячы, іспанскаму народу.

Ад імя мільёнаў рабочых, у інтарэсах абароны іспанскага народа Комуністычны Інтэрнацыянал зноў звяртаецца з прапановай да соцыялістычнага і профсаюзнага інтэрнацыяналаў аб устанаўленні адзінага міжнароднага рабочага фронта.

Дапамагчы рэспубліканскай Іспаніі, абараніць Кітай—гэта азначае змагацца супроць сусветнай вайны, абараніць вашы ачагі, свабоду і незалежнасць вашых краін ад фашысцкіх катаў. Народы, якія дазволілі-б задушыць рэспубліканскую Іспанію або Кітай, прыгатавалі-б у сябе сваімі рукамі фашысцкае ярмо, узмацнілі-б ланцугі свайго ўласнага капіталістычнага рабства.

Таварышы!

Выходзьце на вуліцу ў дзень 1-га мая! Стройцеся ў баявую калону міжнароднага адзінага рабочага фронта дзейснай дапамогі іспанскаму народу!

Зброю іспанскаму народу!

Патрабуйце, пролетарыі Францыі, слаўныя патомкі парыжскіх комунараў, неадкладнага зняцця блакады з рэспубліканскай Іспаніі, станавіцеся на чале міжнароднага руху ўсямернай дапамогі іспанскаму народу!

Рабочыя Англіі! Прымусце вашы кіруючыя класы пакончыць з палітыкай падтрымання фашысцкага разбою і палітыкай варожасці да краіны соцыялізма, да ўсіх народаў, якія змагаюцца за сваю свабоду і незалежнасць. Зламіце супраціўленне рэакцыйных лідэраў вашых профсаюзаў і рабочай партыі міжнароднаму адзінству дзеянняў.

Патрабуйце, пролетарыі ЗША, палітыкі абуздання фашысцкіх парушальнікаў усеагульнага міру, палітыкі, дастойнай традыцый Лінкольна і Вашынгтона. Патрабуйце неадкладнага зняцця забароны на вываз зброі ў Іспанію і Кітай.

Рабочыя Германіі, Італіі і Японіі. Не дазваляйце ператвараць вашы народы ў сляпую зброю катавальніцкіх планаў фашысцкіх урадаў. Зрывайце шымі рашучымі выступленнямі і дзеяннямі, усімі даступнымі вам сродкамі грабежніцкія войны фашысцкіх зладзеяў.

Антыфашысты ўсіх краін! Дабівайцеся выгнання германа-італьянскіх інтэрвентаў з Іспаніі, японскіх захватчыкаў з Кітая, нямецкіх фашысцкіх банд з Аўстрыі.

Патрабуйце ўжывання да фашысцкіх зладзеяў эканамічных, палітычных і іншых санкцый.

Змыкайцеся, працоўныя, з рабочым класам у магутны народны фронт супроць фашызма і імперыялістычнай вайны.

Народы Еўропы, Амерыкі і Азіі! Будуйце разам з вялікім народам Совецкага Саюза міжнародны фронт міру супроць фашысцкіх разбойнікаў, падпальшчыкаў грабежніцкіх войн.

Пролетарыі!

Аб'яднаны рабочы клас капіталістычных краін у саюзе з рабочымі краіны соцыялізма — непераможны. У вашым яднанні з магутным совецкім народам залог разгрому фашызма.

Далоў біч чалавецтва — фашызм!

Далоў падпальшчыкаў вайны!

Няхай жыве адзінства міжнароднага рабочага класа!

Няхай жыве народны фронт барацьбы супроць фашызма і вайны!

Няхай жыве СССР — аплот соцыялізма, міру і свабоды!

Няхай жыве саюз рабочага класа буржуазных краін з рабочым класам краіны соцыялізма!

ВЫКАНАУЧЫ КАМІТЭТ КОМУНІСТЫЧНАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛА

Я сын працоўнага народа...



Маладыя чырвонаармейцы тт. Я. Новікаў, Ібрагімаў Мінехмат і А. Акімаў.
Фота І. Каплінскага.

„РАДЗІМА, ЗАГАДВАЙ—Я ВЫКАНАЮ!..“

Калісьці расказваў мне мой дзядзька, як дзяржымарды-унцеры адносіліся да салдата ў царскай арміі.

Аднойчы ў салдата спытаўся унцер, для чаго служыць баявая спружына ў вінтоўцы. Салдат не ведаў. Тады унцер усунуў яму спружыну ў ноздру і загадаў ісці гусіным крокам да другога салдата. Той таксама не ведаў прызначэння баявой спружыны, і здзекі пачыналіся зноў.

Гэта толькі адзін прыклад, а колькі іх можна прывесці! Салдата не лічылі за чалавека, гэта быў аўтамат, у абавязак якога ўваходзіла служыць гарматным мясам

Я добра разумею, чаму наш народ так любіць сваю Чырвоную Армію,—ён любіць яе таму, што наша Чырвоная Армія абараняе шчасце народа, яго вялікую, неасяжную Радзіму. Наша армія — гэта сам народ.

У дзень першамайскага свята я з вялікай радасцю і гордасцю за сваю Радзіму, за свой народ дам урачыстае абяцанне—ніколі, ніякаму ворагу не аддаваць ні аднаго калiва совецкай зямлі, той зямлі, на якой расквітнела шчасце народаў, насяляючых яе, той зямлі, на якой кожны чалавек стаў чалавекам у поўным сэнсе гэтага слова, стаў грамадзянінам, паважаемым сваёй Радзімай, якая па-бацькоўску клапоціцца аб ім.

Калі будзе вайна, я скажу: «Радзіма, загадвай, і хоць-бы выкананне твайго загада каштавала мне жыцця, я буду выконваць твой загад, афярую за цябе сваё жыццё».

Я. НОВІКАЎ.

Чырвонаармеец Н-скай часці.

ЖЫЦЦЁ МАЕ НАЛЕЖЫЦЬ РАДЗІМЕ

Вы ведаеце, чым быў татарын пры царскай уладзе? Ніякімі словамі нельга дакладна перадаць таго, што перажылі татары, якія здзекі і катаванні з боку царскіх чыноўнікаў бачыў наш народ.

У Ніжнім Тэмерліку (так называецца вёска, дзе я радзіўся) людзі цэлымі сем'ямі ўцякалі ў стэп альбо ў горы, каб пазбегнуць здзекаў і катавання, калі з'яўляўся які-небудзь царскі жывадзёр збіраць падаткі.

Вядома, што мне не давялося гэта бачыць і перажыць, таму я і горды за сваю Радзіму, таму я, як і ўвесь татарскі народ, удзячны вялікім правадырам пролетарыята—таварышу Леніну і таварышу Сталіну за тое, што яны падарылі татарскаму народу самы лепшы і самы каштоўны падарунак—шчасце, за тое, што яны вызвалі татарскі народ з нявол прыгнёту.

Першага Мая я разам з маімі таварышамі па службе—маладымі совецкімі патрыётамі—прысягну на вернасць маёй квітнеючай Радзіме, на вернасць народу і партыі і яе вялікаму геніяльнаму правадыру таварышу Сталіну.

«Я—сын працоўнага народа, грамадзянін Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік...» Як горда, як велічна і ўрачыста гучаць гэтыя словы!

Няхай ведаюць фашысты, што нас нікому, ніколі і ніякімі сродкамі барацьбы не перамагчы. Народы нашай краіны—гэта адзіная сям'я братоў і сясцёр, якія не аддадуць свой дом, сваю зямлю нікому.

ІБРАГІМАЎ Мінехмат.

Чырвонаармеец Н-скай часці.

Я БАЕЦ-ГРАМАДЗЯНІН

Для мяне дзень Першага мая будзе днём вялікай урачыстасці. У гэты вялікі гістарычны дзень я, як сын працоўнага народа, грамадзянін Совецкага Саюза, перад тварам вызваленых класаў нашай шчаслівай Радзімы буду даваць клятву на вернасць сваёй бацькаўшчыне, свайму народу, — клятву любві і адданасці сваёй Радзіме, сваёй большэвіцкай партыі і яе мудраму правадыру, бацьку і выхавальніку, таварышу Сталіну.

Ад сёняшняга дня я яшчэ больш старанна буду вывучаць вайсковую справу, умацоўваць рэволюцыйную дысцыпліну, выконваць усе заданні, якія паставіць перада мною мая радзіма, мой урад.

А. АКІМАЎ.

Чырвонаармеец Н-скай часці.

МАЛАДЫЯ ПАТРЫЁТЫ

Малодшыя камандзіры-артылерысты Манухін і Гудкоў — неразлучныя сябры. Абодва масквічы. Высокія, рослыя, энергічныя энтузіясты баявой і палітычнай падрыхтоўкі, яны не адстаюць адзін ад аднаго ні ў чым. Гудкоў працаваў на Метрабудзе, быў стаханаўцам, мае ўрадавую падзяку. Манухін — рабочы-транспартнік. Сустрэліся яны ў ваенкамаце, блізка пазнаёміліся і падружыліся. Іх накіравалі ў адну часць. У палку яны аказаліся ў адным узводзе, затым былі адабраны ў палкавую школу. На радасць абодвух, яны заўсёды былі разам, адзін ля аднаго. Пачалася кіпучая ўпартая вучоба.

Прыяцелі адразу вылучыліся з масы курсантаў сваімі сур'ёзнымі адносінамі да вучобы, уважлівасцю і стараннасцю. Соцыялістычнае спаборніцтва ўдзесяцерыла іх сілы. Палітычна найбольш развітыя, яны не толькі ішлі наперадзе іншых, але і дапамагалі заўсёды іншым курсантам. Калі трэба было дапамагаць адстаючаму, кіраўнікі школы — лейтэнант Брычыкаў і палітрук Бекарэвіч прымацоўвалі да яго Гудкова ці Манухіна.

Камандзір і палітычны кіраўнік абапіраліся на гэтых таварышоў, выхоўваючы іх у духу большэвізма і бязмежнай адданасці радзіме.

У чырвонаармейскім інтэрнаце, ў ленінскім пакоі, на стрэльбішчы і на тактычных вучэннях Манухін і Гудкоў — лепшыя агітатары. З вялікім захапленнем нясуць яны ў масы чырвонаармейцаў гарачыя і хвалюючыя словы большэвіцкай прапаганды, выхоўваючы ў байцах палкую нянавісць да ворагаў народа, да подлых вырадкаў з трацкісцка - бухарынскай зграі, наймітаў фашызма.

Абодва не маюць ні аднаго дысцыплінарнага спагнання. Неаднаразова прэміраваны. Да дваццацігоддзя Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота абодва занесены на дошку гонару часці. Асабісты прыклад—найвялікшы і дзейсны сродак агітацыі. Гэтым асабістым прыкладам Манухін і Гудкоў захапляюць байцоў, клічуць наперад, да новых дасягненняў у баявой і палітычнай падрыхтоўцы падраздзялення.

Школу малодшага начскладу прыяцелі скончылі з выдатнымі паказчыкамі і засталіся ў школе малодшымі камандзірамі. З вялікай гордасцю нясуць яны пачэсную годнасць выхавальнікаў новых кадраў малодшага начальніцкага складу. Манухін — групавод палітзаняткаў. Чырвонаармеец Бакай гаворыць аб ім:

— О, Манухін моцны. Любіць сваю справу. Вельмі непакоіцца за нас. Мне шмат дапамог. Моцна звязан з чырвонаармейцамі. Карыстаецца ў іх вялікім аўтарытэтам.

Манухін лепшы малодшы камандзір. Працаваў памочнікам камандзіра ўзвода. Некалькі месяцаў камандаваў узводам. Начальнік артылерыі акругі даў яму выдатную ацэнку. Ен лепшы арганізатар заняткаў, умее дыферэнцыравана кіраваць людзьмі. Яго падначаленыя паспяхова авалодваюць баявой тэхнікай, з дня ў дзень растуць і ўдасканальваюцца.

Добра кіруе сваім падраздзяленнем і Гудкоў. Канкрэтна кіруе соцыялістычным спаборніцтвам. Коні ў падраздзяленні заўсёды чыстыя і ў добрым целе.

Манухін і Гудкоў дапамаглі камандаванню школы вырасціць групу выдатных актывістаў, выдатнікаў баявой вучобы і арганізатараў масавай работы.

Н-ская артылерыйская часць узнагароджана ордэнам Працоўнага сцяга БССР за высокія паказчыкі ў баявой і палітычнай падрыхтоўцы.

Манухін і Гудкоў — вартыя выхаванцы часці. Добрыя артылерысты, здольныя арганізатары чырвонаармейскіх мас, чэсныя і адданыя патрыёты нашай цудоўнай радзімы, яны прынеслі і яшчэ прынясуць вялікую карысць роднай доблеснай Чырвонай Арміі.

Вялікую работу вядуць яны ў шэфаў. На падшэфным заводзе яны правялі да трыццаці гутарак з рабочымі аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР, аб міжнародным становішчы і бягучых падзеях.

Некалькі месяцаў назад абодва яны прызначаны намеснікамі палітрукоў. Гонар і давер'е партыі і ўрада яны сустрэлі з найвялікшай удзячнасцю і радасным хваляваннем.

На пытанне аб тым, ці застануцца яны на пажыццёвую службу ў арміі, сябры адказалі:

— Што за пытанне? Праблема даўно вырашана. Застанемся. За шчасце працоўных аддадзім усе сілы, а калі будзе патрэба — дык і жыццё.

У міжнародны дзень пролетарскай салідарнасці працоўных усяго свету—1 Мая — на плошчах гарадоў Совецкага Саюза маладыя чырвонаармейцы ўрачыста скажуць вялікія і простыя словы прысягі. Разам з усёй Чырвонай Арміяй слаўныя артылерысты, пільныя вартавыя рубяжоў нашай радзімы, поўныя велічы і радасці заявяць:

— Я—сын працоўнага народа...

Гэта будзе клятва на вернасць радзіме, ўраду, партыі. Гэта будуць словы любві і адданасці вялікаму, мудраму Сталіну.

Л. ШАПІРА.



Маем чым фашыстаў БІЦЬ

Мы зямлі чужой не хочам
І сваёй не аддадзім.
За сваю радзіму-маці
Усе гарою пастаім.

Сонца ярка засвяціла,
Шчасця ў нас не адабраць,
Мне краіна даручыла
Мірны труд абараняць

Маем танкі, маем пушкі,
Маем чым фашыстаў біць,
Як ударым з самалётаў —
Дык паветра задрыжыць.

Лейся, лейся, ручаёчак,
Не дрыжы, зялёны ліст,
У мяне браценнік лётчык,
А я сам буду танкіст.

Самалёт ляціць над лесам,
Сіні дым валочыцца,
Паступлю ў авіяшколу
І зраблюся лётчыцай.

Ад'язджае мой каханы,
Выйду я на рэчку:
Праваджаю трактарыстам —
Лейтэнантам стрэчу.

Калі зноў вайна пачнецца,
Пойдзем мы з табой у бой:
Ты—чырвоным камандзірам,
Я—чырвонаю сястрой.

У калгасе працадзён
Выпрацаваў трыста,
Я хачу ў арміі
Быць кавалерыстам.

Слава Арміі Чырвонай
І табе, наш родны Клім,—
У барацьбе за перамогу
Мы жыццё ўсё аддадзім.

Паспрабуюць хай фашысты
На нас боем наступаць—
Ім касцей сваіх паганых
Не знайсці і не сабраць.

На гары стаіць дамок
Многапавярховы.
На совецкіх рубяжах
Моцная ахова.

Усюды жыта каласіцца,
Не відаць нідзе мяжы,
А мой мілы на граніцы,
Ахраняе рубяжы.

(Запісана ў розных раёнах БССР).

А. Марціновіч

ЧЫРВОНЫ СЦЯГ

(Першамайская песня)

Сенажаць яшчэ туманіцца,
Росы буйныя губляючы.
Я іду блакітнай раніцай,
Сцяг чырвоны свой трымаючы.
Ярка свеціць сонца майскае,
Рассыпае промні-золата,
Пазірае з неба ласкава
На мой сцяг з сярпом і молатам.
Чырванее ён над вуліцай
І вясёлкай разгараецца.
Сонца майскае не туліцца,
У кволых хмарках не хаваецца.
Гэты сцяг нясу я вёскаю.
А калі вайна-мяцеліца
Загаворыць сабляў лёскатам,
Дымам-порахам пасцелецца,—
Я наш сцяг, як сілу нашую,
Пранясу хадою цвёрдаю
Праз упартыя, бясстрашныя,
Праз баі з фашысцкай ордаю...
Сёння-ж сонца прамяністае
Тчэ узоры свае дзіўныя,
Агнявыя, залацістыя,
Іскрамётна-пераліўныя.
Пралятаюць майскай раніцай
Нашы песні над калонамі.
Я іду. Сцяг уздымаецца,
Сцяг палае над мільёнамі.

Дзве прысягі

Ніколаеўскі сабор ў Бабруйску быў даастатку напоўнен салдатамі. З амвона гундосіў перад шматлікім натоўпам гарматнага мяса плюгавы на выгляд, з вялікім шызым носам попік у епітрахілі.

— Клянуся ўсемагутным богам перад святым яго евангелем... — гнусава выводзіў поп, і велізарны натоўп паўтараў за ім, прысягаючы на «аддаласць» цару, богу і бацькаўшчыне капіталістаў і памешчыкаў. І гэта было падобна на цяжкія ўздыхі, якія з гулам разносіліся пад скляпеннямі змрочнай царквы. Але чым далей ад амвона, тым невыразней мармыталі «ніжнія чыны». Некаторыя толькі рухалі вуснамі, — не рухаць было нельга, за салдатамі пільна сачылі. А ў агарожу царкоўную, дзе стаялі тры роты, гул даносіўся пазней і салдаты паўтаралі ўжо не за папом, а за гулам, за ўздыхамі.

Батальённы камандзір, падпалкоўнік Кашурнікаў, прапанаваў камандзіру палка, князю Гогуладзе, прапусціць на прысягу полк пабатальённа. Палкоўнік Гогуладзе адказаў, што гэта не лазня, — там можа вады не хапіць, а слова божага на ўсіх хопіць, — і загадаў гнаць на прысягу ўсіх запасных цэлым палком, таму што марудзіць няма калі — заўтра адпраўка на фронт.

—... Ды пакарае мяне рука ўсемагутнага тварца...

Натоўпу за агарожай здавалася, што самае страшнае для іх сваякоў пачынаецца якраз пасля гэтай прысягі. І гэта страшнае ў іх уяўленні рысавалася нейкім чорным, юрыважэрным, усёпажыраючым, зверска пачварным, і ад гэтага страшнага жывому чалавеку няма ратунку, прысяга накладае кляймо, з якім чалавек ідзе на смерць.

І вылі, прычытваючы, бабы. І дзеці ўторылі маткам. Інтэлігентная публіка абыходзіла сабор бокам. Прысяга наводзіла на ўсіх жудасць. Яна несла з сабой жах вайны.

Радавы Антон Дыль стаяў недалёка ад папа, і, падняўшы, як ўсе, правую руку ўгору, паўтараў словы прысягі.

Прысяга скончылася і полк ротамі пагналі ў распалажэнне Кутаіскіх казармаў.

Для расейскага солдата
Пули, бонбы нипочем,
С ними он за панибрата...

спявалі пярэднія роты. Не спяваць нельга, — загадана спяваць. За песняй салдат забывае аб усім, — мудра разважае ваеннае начальства.

За палком рынуў і натоўп сваякоў і ўсю ноч на Кутаіскім пляцы быў чуцен лямант, прычытанні. Надрыўна стагнала, уперамежку з выкрыкамі, тальянка. А на досвітку полк нагрузілі ў чырвоныя цяплушкі з надпісам «40 чалавек ці 8 коней» і павезлі ў кірунку Коўна.

Так пачалася для Антона Дыля, селяніна з Упірэвіцкай волесці Барысаўскага павета, служба богу, цару і бацькаўшчыне.



«Перадача данясення». Барэльеф на дрэве работы чырвонаармейца М. Івінскага.
Фота І. Каплінскага.

Ва Усходняй Прусіі, пад Сталупіненам, Дыль быў паранен. Спачатку ён ўзрадаваўся — дахаты адпусцяць, але замест дома яму паказалі фігу, і не паспеў ён ачуняць, як з Гомеля яго з маршавай ротай пагналі на Карпаты. Перад адпраўкай на аўстрыйскі фронт яго яшчэ раз прымусілі прыняць прысягу.

Пакуль Дыль быў на Карпатах, яго адзіная карова здохла з голаду. Пісьмы ад жонкі ён атрымліваў напалову закрэсленымі заўзятымі царскімі цэнзарамі. У такім выглядзе пісьмы атрымлівалі амаль усе. Дыль бачыў, што вайна хутка скончыцца, ён гэта адчуваў — салдаты не хацелі ваяваць. У акопах расла яўная нездаволенасць вайной.

Адбылася першая рэволюцыя. Яна ашукала салдацкія надзеі. Але салдат быў упарты ў цярплівасці і чакаў. Прышоў народжаны ў бурах Кастрычнік. Кастрычнік дэмабілізаваў царскую армію. Дыль вярнуўся дадому з мыліцамі і партбілетам у кішэні. Вайна адняла ў Дыля нагу, але яна дала яму галаву.

Інвалід Дыль пры нямецкай акупацыі неаднаразова падвяргаўся арыштам, але калі прышлі палякі, Дылю давялося пайсці ў лес. Дыль быў начальнікам партызанскага атрада. Неяк раз Дыль трапіў у рукі панам і больш не вярнуўся ў сваю хату.

**

Першамайскае веснавое сонца залівала снапамі залатых праменняў лес, трыбуны ўрада і гасцей. Па абодвух баках прамога, як страла, Барысаўскага шасе выстраіліся ў бясконцай калоне войскі. Сталёвыя птушкі чырвонай авіяцыі на сонцы здаваліся празрыстымі, а спяванне матораў было падобна да гукаў нейкай асаблівай, хвалюючай музыкі. За войскамі калонамі выстраіліся арганізацыі рабочых фабрык і заводаў, прафесіянальныя саюзы. Парад яшчэ не пачынаўся і мора людскіх галасоў гаварыла, радавалася і смяялася ўперамежку з бадзёрай музыкай духавых аркестраў. Мора людзей калыхалася ў радасным узбуджэнні. Месцамі на-хаду арганізоўвалася вясёлая пляска і былі чутны меладычныя, заклікаючыя гукі двухрадак і баянаў.

Не, у гэты дзень нельга не хвалявацца, хочацца спяваць і смяяцца. Хочацца радавацца.

Гэта быў першамайскі парад 1937 г. Комсамолец Дыль Сцяпан Антонавіч у складзе дэлегацыі калгаснікаў-ударнікаў Барысаўшчыны стаяў ля трыбуны. Дыль упершыню бачыў такое свята і хваляваўся. А калі раздалася каманда: «Парад, смірна!» — прыбой радасных людскіх галасоў змоўк. Дыль замёр і яму здалося, што ён ад моцнага хвалявання, якое перахватвае горла, не ў сілах сказаць ні слова. Ен паглядзеў на стаяўшых ля яго калгаснікаў і ўбачыў, што і яны ахоплены тым-жа хваляваннем. Дыль адчуў, з якой сілай ён любіць гэта свята, гэты шматтысячны людскі калектыў, адчуў, што ён сам — член гэтага магутнага калектыва, які святкуе дзень пролетарскай салідарнасці працоўных усяго свету. І Дыль адчуў, што ім авалодвае хваляванне, здольнае выклікаць радасныя слёзы. Сэрца яго напоўнілася гордасцю за сваю шчаслівую радзіму, за сваю Чырвоную Армію.

А воддаль, усцяж шасе, стаялі бясконцыя войскі. Матава паблісквалі каскі байцоў Чырвонай Арміі, колер іх зліваўся з колерам танкаў і бронемашын, а яшчэ далей стаяла на—пагатове конніца. І Дылю захацелася заразжа, неадкладна стаць у рады байцоў, чырвонаармейцаў, быць сярод танкістаў, артылерыстаў, кавалерыстаў. І Дыль зайздросціў кожнаму байцу. А калі пачалася прысяга, калі па ўсяму полю пракацілася грознае:

— Я — сын працоўнага народа... — Дылю хацелася выскачыць з групы гасцей-калгаснікаў, стаць у рады Чырвонай Арміі і разам з усімі, у адзін голас з Чырвонай Арміяй даць урачыстае абяцанне:

— Я — сын працоўнага народа...

Так, ён сын працоўнага народа.

Гэты дзень назаўсёды застаўся ў памяці Дыля.

**

Дыля Сцяпана ўвосень 1937 года заклікалі ў рады Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Дыля залічылі ў кавалерыю. Перадавы ўдарнік свайго калгаса, ён стаў ударнікам і ў Чырвонай Арміі. Палкавая фотагазета некалькі разоў змяшчала фатаграфію Дыля. Дыля ставілі ў прыклад усім байцам. І прыкладнасць яго была сапраўды ўзорнай. Дыль рыхтаваўся стаць малодшым камандзірам.

Калі Дыль ішоў у Чырвоную Армію, ён хваляваўся, — гэта была для яго радасная і велізарная падзея. Ен быў поўны пераменай у сваім маладым, радасным жыцці. А перад медыцынскай камісіяй пры прызыве яго ахапіў страх: «А калі забракуюць?» Ен устрывожана прыслухоўваўся да кожнага слова ўрача, які аглядаў яго. Урач сказаў: «Ого, нічога, будзеш у арміі фізкультурнікам». Словы гэтыя запомніліся, і ён сапраўды стаў узорным ударнікам-байцом, выдатным фізкультурнікам.

Дыль чакаў вялікага свята — Першага Мая. Ен рыхтаваўся да гэтага вялікага дня, як варты сын сваёй радзімы, як сын чырвонага партызана Дыля Антона, як баец-патрыёт, сваёй вялікай і неасяжнай радзімы. Дыль узяў на сябе рад ударных абавязкаў У лісце заахвочванняў Дыля—рад узнагарод. Дыль—выдатны стралок. Дыль — рэкардсмен па раду відаў баявой фізкультуры.

Дыль памятае, як некалі ён з зайздрасцю глядзеў на байцоў, прысягаючых на вернасць сваёй радзіме і рэволюцыі. У дзень Першага Мая 1938 года ён гаворыць словы гэтага ўрачыстага абяцання. Аб гэтым дні ён марыў і да гэтага дня ён гатовы.

Яго голас зліецца з тысячамі галасоў верных сыноў радзімы, байцоў Чырвонай Арміі, узброеных лепшай у свеце баявой тэхнікай, якія даюць урачыстае абяцанне, клятву радзіме «па першаму закліку рабоча-сялянскага ўрада выступіць на абарону рэволюцыі».

В. МУРАТ.

Слава Леніну, слава Сталіну!

СТАЛІН—НАША СОНЦА

На сцяне ў калгасным клубе
Вісіць Леніна партрэт.
Ленін наш даў шчасце людзям
Ленін наш даў людзям свет.

Чыё імя льецца ў песнях,
Над прасторамі ляціць?—
Над калгаснымі палямі
Імя Леніна гучыць.

Помніць Леніна век буду,
У сэрцы беражна насіць.
Як настаўніка і друга
Буду помніць і любіць.

Па тваіх заветах, Ленін,
СССР ўпярод ідзе.
К комунізму родны Сталін,
Скора, скора прывядзе.

Капітан краіны Сталін
Нас вядзе ўсё ўпярод.
Жыць заможнымі мы сталі
І культурным стаў народ.

Мы нуду-бяду забылі,
Надышоў шчаслівы час,
Дзякуй табе, любы Сталін,
Што клапоцішся аб нас.

Куплю Сталіна партрэт
І пастаўлю на стале:
Будзе сэрца весяліцца,
Што глядзіць ён на мяне.

Сталін — друг наш, правадыр,
Сталін — наша сонца.
Любім Сталіна ўсе
Ад душы, бясконца.

(Запісана ў розных раёнах БССР).

ПЕСНЯ ПРА СТАЛІНСКУЮ КАНСТЫТУЦЫЮ

Весялей іграй, гармонь,
Песні пой для нашых дзён,
Канстытуцыю мы маем —
Слаўны Сталінскі закон.

У ёй сталінскія словы
Яркай мудрасцю гараць,
Бо народ наш мае права
Жыццё—шчасце будаваць.

На рабоце, на вучобе—
Мы стаханаўцаў сям'я,
На асвету права маем —
Канстытуцыя дала.

А жыццё—якая радасць,
Найшчаслівая пара!
Адпачынак кожны мае —
Канстытуцыя дала.

Ярка-ярка свеціць сонца,
Асвятляе далі,
Канстытуцыя твая —
Наша гордасць, Сталін.

Дык чаму-ж нам не спяваць,
Чаму не гуляці,
Раз прышлі да нас у хату
Шчасце і багацце.

(Запісана ў калгасе «Усход», Бабруйскага раёна).

ДЗЯКУЙ ВАМ, ТАВАРЫШ СТАЛІН, ЗА ШЧАСЛІВАЕ ЖЫЦЦЁ

Зацвіла ігруша,
Зацвіла і сліва.
Мы ў сваёй краіне
Зажылі шчасліва.

Выйду, выйду пагуляць
У зялёным садзе.
Стала весела нам жыць
Пры калгасным ладзе.

Ой, як выйду за сяло—
Вакол радасць чуецца:
Замест межаў і палос
Поле-шыр красуецца.

Песню звонкую спявае
Трактарыст у полі,
За ўдарную работу
Далі ордэн Колю.

З новым сталінскім статутам
Багацее наш калгас,
Усе адзеты, ўсе абуты,
Усё ёсць цяпер у нас.

Няма старага Палесся,
Дрыгвы, куп'я і балот,
Па Палессю ходзіць трактар
І лятае самалёт.

У сэрцы радасць нібы хвалі
У моры сінім пеняцца.
Кожны можа жыць заможна,
Кожны, хто не леніцца.

Хутка, хутка я паеду,
У Маскву, у самы Крэмль.
Раней тры капы вязала,
А цяпер вяжу я сем.

Выхаджу я на работу,
Выхаджу за ўсіх раней,
Усе рэбяты так працуюць,
Як Стаханаў Аляксей.

Я ў калгасе стаў заможным —
Усё ад працы сваіх рук.
Быць заможным можа кожны,
Даў заможнасць Сталін-друг.


Будзем спраўна працаваць
Мы ў гэтым леце,
Ураджай каб атрымаць
Найлепшы ў свеце.

Ой, гары, агонь наш ясны,
І ніколі не згасай.
Любы друг наш, родны Сталін,
К нам у госці прыязджай.

Свеціць сонца залацicта
На совецкія края.
Сталін! Гордасць для народаў
Канстытуцыя твая.

Мы ад нашага калгаса
Найвялікшаму барцу
Шлем гарачыя прыветы —
Канстытуцыі тварцу.

(Запісана ў розных раёнах БССР).



Разьба па косці. «Гомельскі шклозавод». Работа Р. Эціна—члена гомельскай арцелі «Комунар».



Партрэт тав. Сталіна, вышыты жонкамі каманднага складу ЦС Асоавіяхіма БССР тт. Стулінай, Лукашэвіч, Драгун, Шарахоўскай.

ЖЫЦЦЁ Ў КРАСКАХ І БУКЕТАХ ТОЛЬКІ СТАЛІН ЗМОГ НАМ ДАЦЬ

(КАЛГАСНАЯ ПЕСНЯ)

Як быў цар, тады народы
Гаравалі з года ў год,
За паноў, за жываглотаў
Пралівалі кроў і пот.

Не было на працу права,
Не маглі мы існаваць,
Толькі царская расправа
І была адна чуваць.

Толькі панская «апека»
І была для батрака:
Муштравалі чалавека,
Пагарджалі бедняка.

Не было для нас і школы,
Толькі быў для нас дурман.
Не чыталі мы газеты,
Бо вучыўся толькі пан.

Не было свабоды слова,
Дужа цяжка было нам...
Заганяў цар у падполле
Мы-ж збіраліся і там.

Клікнуў нас таварыш Ленін
Супроць цара выйсці ў бой.
Мы ішлі да вызвалення,
Родны Сталін, за табой.

Нас вядзе таварыш Сталін
За сабою ўпярод,
Каб заможна жыць мы сталі
І шчаслівым быў народ.

Добра жыць нам, а за гэта
Любім песні мы спяваць.
Жыццё ў красках і букетах
Толькі Сталін змог нам даць.

(Запісана ў калгасе імя Карла Маркса, Лепельскага раёна).

ДЗЕНЬ ПЕРШАГА МАЯ

(СКАЗ СТАРОГА КАЛГАСНІКА)

Першага мая ўсе совецкія людзі красуюцца і веселяцца, — такога народу фашысты баяцца.

Совецкія людзі хмары разагналі, князёў і цара прагналі і весела жыць сталі. Не дачакаць панам над намі панаваць і рабочых пад ногі таптаць.

У дзень Першага мая на вуліцы выйдуць шчаслівыя людзі і з песняй вясёлай па вуліцах пойдуць, бы мора, бо ўвесь наш народ не бачыць ужо гора.

Мы ворагаў злых не баімся і ад іх абаранімся. І калі яны на нас будуць ісці, ім дарогі тады не знайсці. І не зможа вораг нам перашкаджаць, бо мы будзем яго бязлітасна знішчаць.

Наш совецкі народ таварыша Сталіна і Ежова вітае, што яны нас ад класавых ворагаў абараняюць. Нам, совецкім людзям, улада наша шчасце дала, і жадаем мы ўсе, каб для народаў сусвету яна была. І таму ўвесь народ у дзень Першага мая любімага Сталіна моцна вітае.

Запісана ад ТУРОМШЫ ЕМЕЛЬЯНА ў калгасе «Шлях праўды», Заслаўскага раёна.

ЯКУБ КОЛАС

ПАСЛЯ ЗІМЫ

Вышла з халоднай пасцелі зямля,
Нібы пасля цяжкай хваробы.
Поле пустое, сырая ралля —
Ніякай украсы, аздобы.
Снегам прыматы галінкі хваін
На ўскрайку знямелых палеткаў.
Прэлае лісце сярод раўчавін —
Бяздушнай зімы недаедкі.
Сям-там засохлых раслін цыбуры
Схіліліся мёртва над долам.
Ходзяць па полі сіроты-вятры,
К зямлі прыпадаючы чолам.
Шэпчуць ёй ціха: «Не плач, не тужы—
Мінула твае амяртвенне!
Сонца развее дыханне імжы
І новае вытча адзенне.
Рунню засцеле гмах шэры палёў,
Акрые шаўкамі даліны.
Будзеш мець выгляд, зямелька, ты зноў
Вясёлай красуні-дзяўчыны».

27-III—38 г.

МІХАСЬ КАЛАЧЫНСКІ

НАСТУПЛЕННЕ ВЯСНЫ

I.

Вясна наступае.
Чарнеюць снягі.
Я чую, зіма, твае ўздрыгі:
На рэках ад водаў трашчаць берагі,
Плывуць пасінелыя крыгі.
І чорныя галкі садзяцца на іх,
Праводзяць ільды ў дарогу.
Вясна маладая на крыллях сваіх
Нясе над зімой перамогу.

II.

Вясна наступае.
Раскрыла зямля
З-пад снегу шырокія грудзі.
І гэта адчулі дубы на камлях,
Адчулі па подыху людзі.
Вясёлка стаіць за сялом,
Хоць дождж красавіцкі не лле 'шчэ.
Вясна маладая крылом
У шыбы ваконныя хлешча.

III.

Вясна наступае.
Усе вокны наўсцяж
Пад поўдзень яна расчыніла.
Падснежнік малое дзіця
На дол за вакно ураніла.
Ад вільгаці чыстых крыніц
За суткі лугі зарунелі...
Праходзіць вясна без граніц
У новым армейскім шынелі.

***

Вясна наступае.
Вясна, наступай!
Я чую паўдзённы твой подых.
Цябе называюць, мой край,
Вясною плямёны, народы.

АНАТОЛЬ АСТРЭЙКА

ІДЗЕ МОЙ КРАЙ


Ідзе цвёрдым
Шагам мой край
Ударнай брыгадай
Свой родны
Совет выбіраць, —
Вярхоўную ўладу.

Народы гамонку вядуць
Сям'ёю адзінай,
На сход небывалы ідуць
Вялікай радзімы.

На згонах,
На руме ля рэк,
На сонечным полі
Чуваць, як пяе чалавек
Пра светлую долю.

Нам шчасце
Навечна далі,
У баях здабывалі
Асілкі вялікай зямлі —
Наш Ленін,
Наш Сталін.

Ідзе цвёрдым
Шагам мой край
Ударнай брыгадай
Свой родны
Совет выбіраць, —
Вярхоўную ўладу.



Разьба па косці. «Ахова совецкай граніцы». Работа Р. Эціна.

Міх. ЛАРЧАНКА

ТЭМА ПРОЛЕТАРСКАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗМА У БЕЛАРУСКАЙ СОВЕЦКАЙ ПАЭЗІІ

У беларускай совецкай паэзіі тэма пролетарскага інтэрнацыяналізма, тэма брэтняй салідарнасці паміж народамі СССР і працоўнымі ўсяго свету, разам з тэмаю совецкага патрыятызму, з'яўляецца асноўнай тэмай. Нашы паэты ніколі не павінны забываць мудрых слоў нашага геніяльнага правадыра таварыша Сталіна аб тым, што «дружба паміж народамі СССР—вялікае і сур'ёзнае заваяванне. Бо пакуль гэта дружба існуе, народы нашай краіны будуць свабодны і непераможны; ніхто не страшны нам, ні ўнутраныя, ні знешнія ворагі, пакуль гэта дружба жыве і здраўствуе».

Паэты Совецкай Беларусі, перакаўшыя ў вершах пісьмо беларускага народа вялікаму Сталіну, вуснамі народа ў паэтычнай форме сказалі аб вялікай сіле совецкага інтэрнацыяналізма, аб дружбе народаў СССР.

І нашай з народамі братнімі дружбы,
Што гора былое змяла ў небыццё,
Клянёмся: ніколі ніхто не парушыць,
Яна наша сіла і наша жыццё.
Калісьці яшчэ у падполлі глыбокім
І Ленін і ты гэту дружбу каваў,
Праз цемру гадоў тых празорлівым вокам
Совецкіх рэспублік Саюз аглядаў.
Народы сумесна прайшлі праз віхуры,
Сумесна сустрэлі свой радасны час,
Ад Негарэлага аж да Амура
Злучыла радзіма вялікая нас.

Народны паэт БССР Якуб Колас у вершы «Народам СССР» з вялікім пафасам апявае сталінскую дружбу народаў, якая з'яўляецца «непрыступным гранітам»:

І я сёння горды, шчаслівы
За нашу з'яднанасць, сям'ю,
Радзіму да сэрца тулю,
І сказ ёй прыношу шчаслівы:
Народы вялікай краіны,
Што селі ў пачэсным куце!
Няхай наша дружба цвіце,
Каб сонцам ірдзелі пуціны.
. . . .
У нашым яднанні мы сіла,
І зубы паломіць бандыт
Аб той непрыступны граніт,
Што дружба народаў стварыла

Сталінская дружба народаў СССР і інтэрнацыянальная салідарнасць працоўных усіх краін з'яўляецца невычарпальнай крыніцай мастацкіх магчымасцей для нашых паэтаў і пісьменнікаў.

Янка Купала стварыў цыкл цудоўных вершаў аб сонечнай Грузіі, аб яе гераічным народзе, аб вялікай грузінскай культуры. У вершы «Сонечнаму Шота Руставелі». Я Купала ў задушэўных радках дае выключны па свайму паэтычнаму майстэрству лірычны пейзаж сонечнай Грузіі:

Грузінка і сонца, і снежныя горы,
Віно вінаграднае, месяц і зоры,
Шчаслівыя сонечна саклі, аулы...
О, колькі прастору для думкі, для чулай!
У скалы мёд зносяць руплівыя пчолы,
Чабан грае песню на зурне вясёлай,
О, слаўная Грузія, Эльбрус герояў,
Як соладка жыці, спяваці з табою!
. . . .
Народ гераічны скрозь горы, даліны
Стагоддзямі з сэрцам радзімай краіны
Да нашага часу, да сталінскай славы
Данёс руставелевы думы і справы.
Стагоддзі, мінулі, йсці будуць стагоддзі,
А ў гордым, свабодным грузінскім народзе
Для песень, для шчасця, хвалюючы грудзі,
Як жыў Руставелі, так вечна жыць будзе.

У вершы «Грузія» Купала зноў з вялікім замілаваннем апявае Совецкую Грузію і з вялікім лірызмам гаворыць аб «доміку у Горы, абвеяным славай», у якім нарадзіўся «той, хто з нявол і люд вывеў, новыя вызначыў свету сцюжалі, той, хто народы збудзіў, ашчасліві... у доміку гэтым убачыў свет Сталін».

Гаворачы аб вершах пра сонечную Совецкую Грузію, трэба адзначыць, што і М. Хведаровіч напісаў вялікую колькасць лірычных вершаў аб гэтай краіне, сярод якіх ёсць і паэтычна ўдалыя творы. У вершы «Радзіма» паэт паказвае братнюю дружбу грузінскага і беларускага народа.

Купала апявае Совецкую Украіну, якую ён любіць як сваю родную Беларусь:

Украіна, цвеце любы
Чараўнічай сілы,
Рэволюцыя з Усхода
Цябе абудзіла...
. . . .
Украіна! Табе вораг
Ніякі не страшны—,
Сцяг твой роўны паміж роўных
У саюзе нашым.
Ты будуеш сабе шчасце
Пад сцягам чырвоным,
Як рэспублікі ўсе нашы
З поспехам цудоўным.

У совецкай беларускай паэзіі ёсць паэтычна моцны верш Пятруся Броўкі «Шчорс», дзе паказваецца герой украінскага народа ў барацьбе за Совецкую Украіну ў часе грамадзянскай вайны.

Цікавым у паказе тэмы пролетарскага інтэрнацыяналізма з'яўляецца верш П. Броўкі «Браты», дзе паэт дае гэтую тэму праз персанажныя вобразы. У гэтым вершы Броўка рысуе чатырох рабочых: грузіна Серго Каўтарадзе, украінца Тараса Піліпенка, таджыка Алі Джасура і беларуса Базыля Каляду. Кожны з гэтых рабочых запрашае адзін другога ў госці. Гэта інтэрнацыянальная, пролетарская салідарнасць паказваецца Броўкам у наступным плане:

Я запрашаю вас, браты,
ў аулы—нашы сёлы,
спяюць красуні нам тады
там песні Грузіі вясёлай.
Кура там б'ецца на палях,
І зор гарыць маяк.
Прыходзь, раз рукі ў мазалях,
Там Грузія твая.

Тарас Піліпенка таксама шчыра запрашае сваіх братоў да сябе, у сваю вольную краіну, дзе «у буйным калоссі палі шалясцяць, і вочы губляюцца ў колерах сініх, шырокі Дняпро там праходзіць наўсцяж і сілу разносіць па вольнай краіне».

Алі Джасур таксама запрашае ў сваю краіну, дзе «цудоўная зара, і караваны йдуць як сны, пяскі зялёныя гараць і ўночы выюць барханы».

Базыль Каляда ў такім-жа плане запрашае братоў у сваю краіну, дзе шумлівыя бары і азёры сустрэнуць іх «як родных, блізкіх сваякоў».

На аснове такога канкрэтнага паказу пролетарскай салідарнасці паэт робіць агульны вывад:

Так, таварышы!
Кожная з нашых рэспублік:
Яго, і твая, і мая—
роўна гналі паноў,
роўна білі разруху...
. . . .
Так, таварышы!
Яна зоркай гарыць
па ўсёй нашай кулі,
яна шлях
для ўсіх нас цяпер.

Вялікі Сталін, тварэц вялікай дружбы народаў СССР і нашай соцыялістычнай Канстытуцыі, паказваецца ў беларускай паэзіі як сімвал совецкага інтэрнацыяналізма:

Ты мудры настаўнік, між геніяў геній,
Сабраў у вянок іх, у золак адзін,
Твая Канстытуцыя — сцяг пакаленняў
Узнімае народы нявольных краін.

У сэнсе паказу жыцця і барацьбы рабочага класа і працоўных мас у капіталістычных краінах цікавымі творамі ў беларускай паэзіі з'яўляюцца «А ў Вісле плавае тапелец» і «Май» Янкі Купалы «Ёсць наша радзіма», Пятруся Броўкі і «Крывёю сэрца» Алеся Жаўрука.

Алесь Жаўрук у сваёй паэме «Крывёю сэрца» у вобразе Франсіскі і Хозе паказвае гераічную барацьбу іспанскага народа супроць мяцежных фашысцкіх генералаў і германа-італьянскіх інтэрвентаў.

Паэт рысуе выключны гераізм Франсіскі Ньето і Хозе, якія гераічна змагаюцца з італа-германскімі інтэрвентамі за сваю радзіму. Яны гераічна гінуць на баявым пасту, на фронце, і іх смерць натхняе рэспубліканскіх салдатаў на яшчэ большую, рашучую і пераможную барацьбу.

Янка Купала палітычна войстра паказвае ў сваіх творах жыццё працоўных у фашысцкіх краінах. Ён у вершы «А ў Вісле плавае тапелец» паказвае, як у фашысцкай Польшчы «крывёй работніцкай заліты завулкі, вуліцы й пляцы». А ў вершы «Май» паэт рысуе інтэрнацыянальную сутнасць пролетарскага свята — Першага Мая, якое «ходзіць па свеце, сонцам ірдзіцца, закованых, спячых кліча ўстаць, збудзіцца». Купала падкрэслівае рэволюцыйнае значэнне дня Першага Мая, які «патрасае грозна троны і кароны», ад якога «дрыжаць сатрапы, цары і царысты».

Мы спыніліся на больш характэрных паэтычных творах беларускай совецкай паэзіі, прысвечаных тэме совецкага інтэрнацыяналізма. На гэту тэму ёсць творы і ў П. Глебкі, і ў А. Александровіча, і ў А. Шарапава, і ў М. Калачынскага, і ў Э. Агняцвет.

Трэба ўсё-ж адзначыць, што гэта асноўная тэма беларускай совецкай літаратуры не ўсімі паэтамі нашымі належным чынам асвайваецца і распрацоўваецца. На гэта паэтам трэба звярнуць асаблівую ўвагу.

У ДРУЖНАЙ РАБОЦЕ З ТЭАТРАМ

Змаганне беларускага народа з польскімі акупантамі — гэта вялікая і хвалюючая падзея ў гісторыі Беларусі. Лепшыя сыны народа ўзяліся за зброю, каб раз і назаўсёды пакончыць з векавымі сваімі ворагамі — панамі, капіталістамі і іх прыхвснямі, каб заваяваць сабе права на чалавечае існаванне. Многія змагаліся ў радах Чырвонай Арміі плячо ў плячо з прадстаўнікамі ўсіх іншых народаў цяпер вялікага Совецкага Саюза. Другія, застаўшыся ў тылу белапольскай арміі, арганізоўваліся ў партызанскія атрады і, не гледзячы на здрады і правакацыі ворагаў, былі вернымі памочнікамі Чырвонай Арміі ў разгроме белапалякаў.

Адлюстраваць, хоць у малой меры, тую вялікую народную драму, якая разыгралася на прасторах Беларусі,—гэта было маёй задачай, калі я прыступіў да напісання п'есы. Спачатку намеры ў мяне былі зусім скромныя—даць п'есу для самадзейнага тэатра, але па меры таго, як я ўцягваўся ў работу, падзеі захаплялі мяне ўсё больш і больш, вобразы абрысоўваліся выразней, і ў выніку з'явілася п'еса «Партызаны». Дапрацоўваў п'есу я ўжо разам з тэатрам.

Як ні дзіўна, але адной з цяжкасцей пры напісанні п'есы была актуальнасць і папулярнасць тэмы: справа ў тым, што ўжо многія пісьменнікі ў розных жанрах распрацоўвалі гэту тэму. Здавалася, што ні напішаш, дык гэта ўсё будзе не нова, не свежа, не цікава. Некаторыя таварышы мне проста раілі адмовіцца ад напісання п'есы на гэту тэму альбо абмежавацца малымі варыянтамі.

Другая цяжкасць заключалася ў тым, што ў вузкія рамкі сцэнічнай пляцоўкі трэба было ўмясціць вялікія гістарычныя падзеі. Тут мімаволі прышлося абмежаваць сябе: узяць невялікую колькасць людзей і правесці іх праз невялікую колькасць эпізодаў. Цалкам перамагчы гэту цяжкасць мне так і не ўдалося, паколькі ў п'есе ўсё-ж такі дзевяць карцін і складаныя перастаноўкі дэкарацый.

З задавальненнем адзначаю нашу дружную работу з тэатрам, у першую чаргу з тав. Рахленка і тав. Саннікавым. Калі ў тым ці іншым выпадку нашы погляды разыходзіліся, мы ніколі не ставілі адзін другому «ультыматумаў», а ўсебакова абмяркоўвалі, як будзе тое ці другое лепш для справы, і заўсёды прыходзілі да згоды.

Амаль усе асноўныя ролі ў п'есе выконваюць маладыя акторы. Іх ігрой я задаволен. Асабліва я ўдзячны тав. Бараноўскаму, які выконвае ролю дзеда Бадыля.

Паціскаю руку мастаку Барысу Малкіну за ўдалае афармленне і кампазітару тав. Туранкову за добрую музыку.

К. КРАПІВА.

П'ЕСА АБ НЯНАВІСЦІ ДА БЕЛАПОЛЬСКІХ ПАНОЎ

Натхніць калектыў тэатра на сапраўдную творчасць можа толькі той драматургічны матэрыял, які напісан шчыра, у якім адчуваецца усхваляванасць самога аўтара, калі аўтар можа шчыра любіць і ненавідзець, паказваючы сваіх станоўчых герояў, альбо выкрываючы да канца твар ворага, калі аўтар, як верны сын сваёй соцыялістычнай радзімы, захоплены думкай праўдзіва паказаць барацьбу свайго народа супроць векавога ворага — польскіх паноў.

П'еса К. К. Крапівы «Партызаны» з'яўляецца якраз такім удзячным матэрыялам. Народнасць п'есы, чоткая ідэйная накіраванасць, яскрава акрэсленыя вобразы, правільнае і цікавае развіццё сюжэта, цікавыя сцэнічныя сітуацыі — усё гэта натхніла калектыў нашага тэатра пры стварэнні спектакля.

Перад намі стаяла задача праўдзіва паказаць, як беларускі народ, пры дапамозе вялікага братняга рускага народа, змагаўся за Совецкую Беларусь, і паказаць так, каб гэты паказ будзіў у гледача пачуццё патрыятызма, падтрымліваў у яго гарачую любоў да сваёй соцыялістычнай радзімы і будзіў нянавісць да ворагаў.

У часе работы над п'есай «Партызаны» калектыў выязджаў у мястэчка Дукоры, дзе жывуць партызаны і сваякі расстраляных белапалякамі партызанаў. На гэтай сустрэчы чыталася і абмяркоўвалася п'еса. Артысты знаёміліся з партызанамі, сваякамі партызанаў, вывучалі тыпаж і слухалі апаваданні аб сапраўдных падзеях у часе белапольскай акупацыі. Гэтая сустрэча прынесла шмат карысці. Калектыў тэатра здолеў акунуцца ў атмасферу таго гістарычнага часу, які адлюстроўваецца ў п'есе. Так, напрыклад, узнікла і думка аб тым, каб галоўны персанаж п'есы Даніла Дрыль быў матросам, што адпавядала рэчаіснасці і дало магчымасць больш яскрава акрэсліць гэты вобраз.

У парадку самакрытыкі трэба адзначыць, што некаторыя сцэны спектакля трэба яшчэ больш дапрацаваць як з рэжысёрскага, так і з акторскага боку (народныя сцэны, фінал), што ў бліжэйшы час і будзе зроблена. Мы спадзяемся, што шчыльная сувязь нашага тэатра з К. Крапівой яшчэ больш узмацніцца і ў недалёкім часе мы зможам паказаць нашаму гледачу рэзультаты нашай дружбы.

Трэба адзначыць, што тэатральны сезон 1937-38 года паказвае значны рост арыгінальнай беларускай драматургіі. Ачысціўшыся ад ворагаў народа і ліквідуючы рэшткі шкодніцтва, нашы лепшыя пісьменнікі пад кіраўніцтвам партыі праявілі вялікую актыўнасць у галіне драматургіі.

Але і гэтага яшчэ недастаткова. Трэба зацікавіць і нашу пісьменніцкую моладзь работай у тэатры, гэта-б дало магчымасць выявіць новыя кадры драматургаў.

К. САННІКАЎ.
Рэжысёр спектакля.



«ПАРТЫЗАНЫ» К. КРАПІВЫ У БЕЛДЗЯРЖДРАМТЭАТРЫ.
НА ЗДЫМКУ: (злева направа) арт. С. Кісель у ролі Настуся, арт. Б. Ямпольскі ў ролі Батуры, арт. М. Шашалевіч у ролі Настулі

Падрыхтоўка да выбараў у Вярхоўны Совет БССР

ЛЕПШЫХ СЫНОЎ РЭСПУБЛІКІ—У ВЫБАРЧЫЯ КАМІСІІ

Два дні таму назад—28 красавіка — апублікаваны спісы зацверджаных акруговых выбарчых камісій па Менскай вобласці.

Аднačасова зацверджаны акруговыя выбарчыя камісіі па Гомельскай, Магілеўскай, Палескай і Віцебскай абласцях. Усяго зацверджана 2452 чалавекі.

Сярод вылучаных у акруговыя выбарчыя камісіі значны проц. жанчын, а таксама значны процант беспартыйных. Напрыклад, па Гомельскай вобласці з 396 чалавек—51 жанчына, 149 членаў і кандыдатаў партыі, 96 комсамольцаў, 11 спачуваючых, 140 беспартыйных; па Магілеўскай вобласці з 607 чалавек — 158 жанчын, 215 членаў і кандыдатаў партыі, 137 комсамольцаў, 42 спачуваючых, 213 беспартыйных, 219 калгаснікаў; па Палескай вобласці з 288 чалавек—100 членаў і кандыдатаў партыі, 78 комсамольцаў, 19 спачуваючых, 91 беспартыйны, 127 калгаснікаў; па Віцебскай вобласці з 567 чалавек — 152 жанчыны, 199 беспартыйных і г. д.

Вылучэнне кандыдатаў у выбарчыя камісіі прайшло пры велізарным палітычным уздыме актыўнасці працоўных. З асаблівай увагай, з павышанай пільнасцю падыходзілі працоўныя да канструявання выбарчых камісій. Па кожнай кандыдатуры выступалі дзесяткі людзей. У выбарчыя камісіі вылучаны самыя дастойныя, самыя адданыя партыйныя і непартыйныя большэвікі. Вылучаны лепшыя стаханаўцы прамысловасці і сельскай гаспадаркі, партыйныя, профсаюзныя, комсамольскія работнікі, байцы і камандзіры Чырвонай Арміі, пагранічнікі, прадстаўнікі працоўнай інтэлігенцыі, якія даказалі на справе сваю здольнасць весці вялікую палітычную і адказнейшую работу па арганізацыі выбараў у Вярхоўны Совет БССР.

Гэту палітычную адказнасць падзяляе кожны сумленны працоўны нашай соцыялістычнай радзімы. На мітынгах і агульных сходах, прысвечаных падрыхтоўцы да выбараў, назіраецца велізарны ўздым і радасць. У кожным выступленні, у кожнай прамове падкрэсліваюцца вялікія перамогі першай у свеце краіны соцыялізма, перамогі, атрыманыя народамі СССР пад выпрабаваным кіраўніцтвам комуністычнай партыі і мудрага правадыра—вялікага Сталіна, у бесперапыннай барацьбе з ворагамі народа, з трацкісцка-бухарынскімі шпіёнамі, дыверсантамі, забойцамі.

У бліжэйшыя дні пачнецца вылучэнне кандыдатур ва ўчастковыя выбарчыя камісіі. Прадстаіць вылучыць новыя тысячы лепшых, адданых партыйных і непартыйных большэвікоў.

БОЛЬШ АКТЫЎНАСЦІ

Совецкая Беларусь пачала важнейшую палітычную кампанію — падрыхтоўку да выбараў у Вярхоўны Совет БССР.

Ужо ёсць добрыя прыклады ўключэння работнікаў мастацтваў у выбарчую кампанію. Дзяржаўны яўрэйскі тэатр БССР, які знаходзіцца на гастролях у Віцебску, вылучыў са свайго калектыва агітатараў, якія працуюць на выбарчых участках. Шэсць актораў тэатра дапамагаюць калектывам мастацкай самадзейнасці прадпрыемстваў. Ствараюцца спецыяльныя канцэртныя брыгады для выступленняў на выбарчых участках.

Дзяржаўны Віцебскі тэатр, які працуе ў Магілеве, рыхтуе і з 5 мая пачне паказ падрыхтаванага тэатрам літаратурна-музыкальнага мантажа, прысвечанага выбарам. З песень, казак і частушак аб вялікім Сталіне, Сталінскай Канстытуцыі, соцыялістычным росквіце БССР — лепшых узораў народнай творчасці, з твораў совецкіх пісьменнікаў і народных танцаў складзен гэты мантаж. Канцэртныя брыгады тэатра будуць паказваць мантаж працоўным Магілева і рабочым лесасплава.

Дзяржаўны рускі тэатр БССР мае на мэце стварыць дзве канцэртныя брыгады і падрыхтаваць дзве аднаактавыя п'есы, прысвечаныя выбарам. Шэсць актораў тэатра працуюць агітатарамі на выбарчых участках. У тэатры працуюць тры гурткі па вывучэнню Канстытуцыі БССР і «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР». З 1 мая намечана выпускаць у тэатры спецыяльны бюлетэнь, прысвечаны выбарам.

Над інтэрмедыяй для Дзяржаўнага дзіцячага тэатра БССР працуюць заслужаны артыст Міровіч і кампазітар Цікоцкі.

Калектыў Тэатра музкамедыі БССР вывучае Канстытуцыю БССР і Палажэнне аб выбарах. Тэатр стварае тры канцэртныя брыгады па абслугоўванню выбаршчыкаў.

Усімі тэатрамі намечаны патрэбныя і важныя мерапрыемствы. Але, нажаль, многія справы фігурыруюць пакуль толькі ў планах.

Недаравальна тое, што большасць тэатраў не мае яшчэ патрэбнага рэпертуару, прысвечанага выбарам у Вярхоўны Совет БССР. Бездапаможным у падрыхтоўцы такога рэпертуару аказалася і Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР. Тэатральны аддзел Упраўлення абмежаваў свае функцыі рассылкай тэатрам старых матэрыялаў, якія ім даўно ўжо вядомы.

Нельга марудзіць ні мінуты. Упраўленне па справах мастацтваў, тэатры павінны, прыцягнуўшы паэтаў, пісьменнікаў, кампазітараў БССР, неадкладна скласці адпаведны рэпертуар для брыгад па мастацкаму абслугоўванню выбарчых участкаў. Патрэбна максімальна фарсіраваць тэмпы падрыхтоўкі інтэрмедый і іншых відаў мастацкай прапаганды.

А. Б.



УСЕ СРОДКІ МАСТАЦТВА—ВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ

(Зварот калектыва работнікаў Тэатра оперы і балета да ўсіх работнікаў мастацтваў БССР).

26 чэрвеня 1938 года свабодны, шчаслівы народ ордэнаноснай Совецкай Беларусі будзе выбіраць вышэйшы орган сваёй дзяржаўнай улады—Вярхоўны Совет Беларускай ССР.

Мы будзем галасаваць за лепшых людзей нашай рэспублікі—за партыйных і непартыйных большэвікоў, беззаветна адданых партыі Леніна—Сталіна, за людзей, якія горача любяць нашу соцыялістычную Радзіму, за людзей, якія ненавідзяць ворагаў народа і вядуць з імі бязлітасную барацьбу.

Мы абяцаем нашай комуністычнай партыі, яе ленінска-сталінскаму ЦК і вялікаму Сталіну, што будзем яшчэ пільней сачыць за падкопамі ворагаў, бязлітасна выкарчоўваць іх, умацоўваць абараназдольнасць нашай Радзімы.

Падрыхтоўка да выбараў у Вярхоўны Совет БССР ставіць перад усімі работнікамі фронта мастацтваў вялікую задачу: усімі сродкамі мастацтва абслужыць выбарчую кампанію.

Беларускі дзяржаўны тэатр оперы і балета ўключаецца ў гэту пачэсную работу і бярэ на сябе наступныя абавязацельствы:

Усяму калектыву вывучыць Канстытуцыю БССР і «Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР».

Выдзеліць мастацкія брыгады са спецыяльнай праграмай для штодзённага абслугоўвання выбарчых участкаў горада Менска.

Выдзеліць 10 актораў для дапамогі мастацкай самадзейнасці.

Выдзеліць дзве брыгады для абслугоўвання далёкіх раёнаў БССР.

Арганізаваць выстаўку, прысвечаную выбарам у Вярхоўны Совет БССР.

Падрыхтаваць інтэрмедыю для паказу перад спектаклямі ў дні выбарчай кампаніі.

Мы, работнікі Белдзяржтэатра оперы і балета, звяртаемся да ўсіх работнікаў мастацтва Совецкай Беларусі з заклікам актыўна ўключыцца ў работу па абслугоўванню выбараў у Вярхоўны Совет БССР.

Няхай жывуць свабодныя дэмакратычныя выбары ў Вярхоўны Совет БССР!

Няхай жыве вялікі правадыр і настаўнік працоўных таварыш Сталін!

По даручэнню агульнага сходу калектыва:

Засл. арт. рэсп. **Александроўская**; салісты оперы: **Мурамцаў, Капрэ, Балоцін, Мелькова, Мулер, Васільева**; дырыжоры: **Сцяпанаў, Ратнер, Шнейдэрман, Белазоўскі**; рэжысёр **Хайлаў**; салісты аркестра: **Кузнец, Крук**, дырэктар—мастацкі кіраўнік тэатра **Ярыкаў**, парторг **Жылевіч**, старшыня МК **Кецлах**, рабочы сцэны **Венглінскі**.

М. ЮДЭЛЕВІЧ

„ПАРТЫЗАНЫ“

ЗАМЕТКІ АБ П'ЕСЕ І СПЕКТАКЛІ

Праўдзівыя і яркія сцэны п'есы К. Крапівы ўваскрашаюць перад гледачом незабыўныя дні гераічных баёў партызанаў і Чырвонай Арміі супроць крывавых белапольскіх інтэрвентаў, дні, калі з дапамогай вялікага рускага народа беларускі народ вызваліў сваю зямлю ад белабандытаў.

Экспазіцыя п'есы добра паказвае стыхійны рост партызанскага руху там, дзе народ паспеў пазнаць, што такое совецкая ўлада, і не можа прымірыцца з тым, каб зноў стаць «быдлам» для пана, зносіць здзекі і пабоі. Вырасла самасвядомасць народа за першыя месяцы совецкай улады. Народ узнімаецца супроць сваіх прыгнятальнікаў, белапольскіх інтэрвентаў.

У вобразе большэвіка, чырвонага камісара Скібы аўтар паказвае кіруючую ролю комуністычнай партыі ў арганізацыі партызанскага руху, паказвае саюз пролетарскага горада з працоўным сялянствам у барацьбе за совецкую ўладу.

Вобразы партызанаў, выведзеныя ў п'есе, рознастайныя і характэрныя. Мужны і скромны начальнік партызанскага атрада, былы матрос Даніла Дрыль. Дзед Бадыль—выдатны мастацкі вобраз і ў п'есе і ў спектаклі, увасабленне народнага свабодалюбства, сілы духу, адвечнай нянавісці працоўнага народа да сваіх прыгнятальнікаў,—вобраз, насычаны цудоўным народным гумарам. Характэрная і фігура бежанца Батуры, гармонік і песенька якога добра дапамагаюць барацьбе партызанаў. Характэрныя фігуры партызанаў Халімона і Міхаля. У вобразе Рыгора аўтар наглядна паказвае барацьбу двух маральных пачаткаў: звярынай, кулацкай прагнасці і подласці—з маральнай сілай працоўнага народа, згуртаванага ў барацьбе супроць інтэрвентаў. Іграючы на пачуцці кахання, а таксама на ўласніцкіх інстынктах бедняка Рыгора, кулацкая дачка Кацярына спрабуе штурхнуць Рыгора на шлях здрады, але перамагае класавае пачуццё: нож, які Кацярына ўклала ў рукі Рыгору, ён накіроўвае не супроць Данілы, а супроць самой Кацярыны, вырашыўшы гэтым мучыўшую яго барацьбу паміж пачуццём і сумленнем, абавязкам.

Гэта не адзіны эпізод у п'есе Крапівы, дзе маральная сіла народа супроцьпастаўлена нізкасці пачуццяў і подласці ўчынкаў кулакоў і паноў. Параўнаем вобраз маці Дрыля, якая падставіла грудзі пад кулю, каб абараніць сына, і самога Дрыля, які, рызыкуючы жыццём, прыходзіць ратаваць сястру,—з вобразам панскага сабакі Маргуна, з ягонай дачкой, якая варта свайго бацькі, з вобразам Шмігельскага, з вобразамі пана і пані Яндрыхоўскіх.

Гэта ўнутраная лінія барацьбы двух класавых лагераў вельмі значна паглыбляе, узмацняе п'есу Крапівы, надае ёй характар абагульнення. П'еса дае вобраз народа, паказвае яго аптымізм, веру ў перамогу над ворагам, паказвае, як лепшыя маральныя якасці выкоўваюцца ў працэсе рашучай і смяротнай барацьбы з ворагам.

Без гэтай унутранай тэмы п'еса звялася-б да апошняга паказу барацьбы партызанаў з белапалякамі.

Але ці дастаткова поўна і ярка даносіць К. Крапіва гэту ўнутраную тэму п'есы? Тут хочацца хоць-бы каротка адзначыць недахопы драматургічнай пабудовы п'есы, якія ў значнай ступені зніжаюць яе мастацкую сілу.

Крапіва добра адчувае кожную асобную сцэну, ён знаходзіць яркі сцэнічны эфект для кожнай сцэны, умее зрабіць цікавым, дасціпным і праўдзівым дыялаг дзеючых асоб. Але, калі прасачыць за развіццём усяго сюжэта п'есы, можна лёгка пераканацца, што ён слаба прадуман у цэлым. Сцэна жыве сваім самастойным жыццём і мае свой уласны «матор» замест таго, каб атрымліваць рух ад агульнай спружыны дзеяння п'есы. Возьмем для прыкладу IV карціну. На сцэне партызанскі атрад у лесе. Аўтар не паказвае дзеяння гэтай сцэны ў сувязі з дзеяннем папярэдніх і наступных карцін п'есы, а выдумляе спецыяльныя сітуацыі, каб «паказаць» жыццё партызанскага атрада.

Такой сітуацыяй з'яўляецца гісторыя з запіскай, патрэбнай для вызвалення партызанаў, якім пагражае кара смерцю. Але гэта—выпадковая для гледача сітуацыя, ён не ведае арыштаваных партызанаў, не ведае акалічнасцей іх арышту. Для непасрэднага эмацыянальнага ўздзейнічання на гледача драматычная сітуацыя павінна праходзіць на яго вачах і лагічна развівацца. Таму, калі ў наступнай карціне Батуру прыносяць вестку, што партызаны загінулі,—у гледача ў свядомасці не нараджаюцца словы, якія гаворыць Батура: «Сотні стануць на іх месца». Паведамленне гэта для яго—факт па-за п'есай, не ў ходзе развіцця п'есы. Такі-ж характар другой сітуацыі—смерць партызана Антона. Як ён памёр і чаму? У п'есе (і ў спектаклі) няма нават намёку на бой ці іншыя абставіны, у якіх мог-бы загінуць Антон. Гэта смерць таксама па-за п'есай, — сітуацыя, якая звалілася на гледача невядома адкуль. Гэта толькі повад для прамовы Данілы.

Ва ўсёй п'есе няма аб'ядноўваючага, прадуманага сюжэта. А майстэрства драматургіі ў тым і заключаецца, каб добрую ідэю, цікава задуманыя вобразы п'есы, думкі і замыслы аўтара выразіць у так пабудаваным сюжэце п'есы, у якім-бы яны знайшлі найбольш яркае сцэнічнае выяўленне, дзе ўсе сітуацыі былі-б разлічаны на поўнае, дзейснае раскрыццё характараў, дзе дзеянне было-б разлічана так, каб паслядоўна, псіхалагічна праўдзіва раскрываліся героі. Дакладны разлік, майстэрства пабудовы неабходны драматургу не менш, чым глыбіня пачуцця, глыбіня нагляданняў. Усякая неахайнасць формы балюча б'е перш за ўсё па зместу.

І сапраўды, хіба не траціць вобраз Данілы Дрыля ад недахопаў сюжэта п'есы? Няма лагічнага дзейснага раскрыцця вобраза і адсюль аднафарбавасць, некаторы прымітывізм Дрыля і раду іншых вобразаў.

Была ў аўтара магчымасць стварыць моцны вобраз павятовага начальніка Яндрыхоўскага, але з-за бяздзейнасці эпізода ў другой карціне, недадуманасці гісторыі з запіскай, якая вісне ў паветры, вобраз атрымаўся схематычны, неарыгінальны,—гэта паўтор шмат разоў паказаных на сцэне тыпаў польскіх афіцэраў.

Мы гаварылі вышэй, што кожная сцэна ў паасобку пабудавана сцэнічна, але характар гэтай сцэнічнасці не заўсёды можа выклікаць адабрэнне. Праўда, сцэны выклікаюць вострую і патрэбную рэакцыю глядзельнай залы, нянавісць да ворага, хваляванне за лёс сваіх герояў. Але злоўжыванне гэтымі прыёмамі, якімі поўны ўсе сцэны, псуе п'есу. Часта ва ўгоду эфекту аўтар парушае псіхалагічную праўду вобраза, прыклад—канец V карціны, дзе Рыгор «пад заслону» марыць аб 15 тысячах, якія абяцаюцца ў аб'яве за галаву Данілы. Гэта накіроўвае гледача на няправільныя адносіны да Рыгора, глядач чакае ўжо ў VI карціне здрадніцтва Рыгора. Між тым, аўтар рысуе Рыгора ў гэтай карціне зусім інакш. Так ва ўгоду большаму сцэнічнаму напружанню парушаецца псіхалагічная праўда вобраза. Думаецца, што злоўжыванні сцэнічнымі эфектамі—недахоп драматургічнага майстэрства аўтара.

Пасля «Канца дружбы» К. Крапіва вельмі значна вырас як драматург. Гэта паказвае, што драматургія для яго не выпадковы жанр, што ён сур'ёзна працуе і будзе прадаўжаць работу над драматургічнымі творамі. Але з новай п'есы Крапівы відаць, што ён пакуль што ідзе ў авалоданні драматычнай формай не па шляху найбольшага супраціўлення. І задача крытыкі, тэатра — арыентыраваць Крапіву на больш паглыбленае авалоданне вопытам сусветнай драматургіі, на стварэнне больш глыбокіх, больш арыгінальных і майстэрска пабудаваных п'ес.

Абмяжоўвацца выхваленнем п'есы Крапівы, якая мае вельмі моцныя бакі, якая карыстаецца заслужаным поспехам у гледача, і не ўказваць на сур'ёзныя недахопы—значыць затрымліваць рост драматурга, які абяцае ўзбагаціць беларускую совецкую драматургію высокакаштоўнымі п'есамі.

***

Вельмі добра, што маладыя акторы атрымліваюць адказныя ролі ў новых пастаноўках Белдзяржтэатра.

Большасць выканаўцаў у «Партызанах»—маладыя акторы. Ролю дзеда Бадыля выконвае А. Бараноўскі, выконвае добра, з вялікім тактам, мякка і жыццёва праўдзіва. Актор пазбавіўся ад празмернай шаржыроўкі, якой вызначаліся яго папярэднія работы. На гэтай рабоце Бараноўскі вырас і абяцае ў будучым, пры ўмове сур'ёзнай работы над сабой, многае. Поспех маладога актора яшчэ раз паказвае, што трэба смела высоўваць здольную моладзь на вялікія ролі.

Другую цэнтральную ролю—ролю Данілы Дрыля выконвае таксама малады актор П. Пекур. Ён не зусім падыходзіць да ролі. У актора добрыя даныя, але мала вопытнасці, мала ўнутранай сілы і пераканаўчасці. Яго Даніла — занадта шэры, схематычны, а ён павінен быць больш гераічным і цікавым. Актору не ўдаецца праўдзіва перадаць перажыванні Данілы ў IV карціне—пры ўспамінах аб маці; цікавай павінны быць яго сцэны з Рыгорам; актор іграе занадта знешне, скавана; лепш за ўсё яму ўдалася прамова над трупам Антона. П. Пекуру трэба прадаўжаць працаваць над роллю.

Добра справіліся са сваімі ролямі акторы Сцэпсновіч — Маргун, Шапко — Шмігельскі, Ямпольскі—Батура, Краўцоў—Скіба, Міронава—маці; добра выконваецца роля Кацярыны. Запамінаюцца Халімон і Міхаль у выкананні актораў Глебава і Пушкевіча.

Рыгору ў выкананні акт. Шапілы нехапае жыццёвай бытавой праўдзівасці; ён часта больш нагадвае персанаж меладрамы, чым жывога вясковага хлапца, бедняка. Глядач недастаткова адчувае і верыць у яго неадольнае каханне да Кацярыны, таму і перажыванні яго губляюць канкрэтнасць і жыццёвасць. Гэты недахоп яшчэ ў большай меры ўласцівы К. Быліч (Яндрыхоўскі). Не ўдаецца стварыць вобраз пані Яндрыхоўскай артыстцы Вашкевіч.

Пастаноўшчык спектакля Л. Рахленка і рэжысёр К. Саннікаў надалі спектаклю патрэбную прастату, натуральнасць і шчырасць. Перададзены ў спектаклі і высокагераічны сэнс барацьбы народа за сваю свабоду, але ён мог-бы гучаць яшчэ больш гераічна, узднята—у двух сцэнах у лесе, у масавых сцэнах II і III карцін. Занадта багата статыкі і звычайнасці ў гэтых сцэнах.

Мастак Б. Малкін, які ўпершыню выступае як тэатральны мастак, стварыў добрае ўвогуле мастацкае афармленне спектакля. Добрыя I карціна, сцэны ў лесе. Але хата занадта абстрактная і прытым чамусьці адна і тая-ж хата для III і VI карцін. З добрым густам і вялікай стараннасцю выканана апошняя карціна—у замку Яндрыхоўскага. Але залішняя аддзелка гэтай сцэны мала апраўдана, гэта толькі адцягвае ўвагу гледача, да таго-ж замак гэты—па-за часам і прасторай, ён не характэрны для данай абстаноўкі. У афармленні гэтай карціны сказваецца схільнасць мастака да эстэтызацыі прадмета.

Добрыя ў спектаклі песні, напісаныя кампазітарам А. Туранковым.

Спектакль «Партызаны» заслужана карыстаецца вялікім поспехам у гледача. Гэта добры і хвалюючы спектакль. Ён дае праўдзівую і яркую мастацкую карціну барацьбы працоўнага беларускага народа супроць крывавых белапольскіх інтэрвентаў, паказвае ролю партызанскіх атрадаў, якія дапамагалі Чырвонай Арміі выганяць белапалякаў з совецкай зямлі, правільна рысуе ролю комуністычнай партыі, як арганізатара партызанскага руху, братнюю дапамогу рускага народа беларускаму народу ў барацьбе за свабоду, за совецкую ўладу. Спектакль хвалюе, выклікае гарачыя патрыятычныя пачуцці ў гледачоў.

Шмат якія з недахопаў спектакля, на якія мы тут указалі, могуць і павінны быць выпраўлены, калі тэатральны калектыў яшчэ папрацуе над спектаклем, а ён гэтага заслугоўвае.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Уп. Галоўлітбела Г—4641.